Сп. В. Д. Селяменеву,
галоўнаму архівісту
Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь
пр. Незалежнасці, 116
220114 г. Мінск

Сп-ні Н. В. Кірылавай,
каардынатару праекту
Беларускі фонд міру
вул. Старажоўская, 5
220029 г. Мінск

Вячоркі Аляўціны Сямёнаўны,
вул. К.Маркса, 42-26,
220030 г. Мінск

Шаноўная Наталля Віктараўна, шаноўны Вячаслаў Дзмітрыевіч,

Вялікі дзякуй Вам за доўгачаканае ўключэнне вёскі Рубрын Мерлінскага с/с Давыд-Гарадоцкага р-на Пінскай вобласці ў спіс вёсак, знішчаных у гады Другой сусветнай вайны.

На старонцы http://db.narb.by/search/5609 падаецца абагульненая інфармацыя пра вёску. Прашу ўнесці ў яе некалькі ўдакладненняў, якія вынікаюць з далучаных дакументаў і з бібліяграфіі пытання.

**Год разбурэння – 1943**

**Дата разбурэння – зіма 1943 г.,** студзень 1944 г. (спаленыя апошнія 2 дамы). *Гл. успаміны П. І. Скрыпскага.*

Дамоў да вайны ў вёсцы было 45, **людзей да вайны** было **166** (паводле перапісу **1939 г.**). *Гл. “Памяць. Столінскі раён”. Мн.: БелТА, 2003. С. 196.*

**Забіта людзей – 12.** *Гл. успаміны П. І. Скрыпскага. Ён як больш сталы на той час чалавек успомніў на аднаго забітага больш у параўнанні з І. С. Маслам, з чым апошні пагадзіўся.*

На жаль, адна з аўтараў успамінаў, Рафаловіч (Масла) Ніна Сцяпанаўна, памерла ў 2012 г., што, магчыма, варта адлюстраваць у інфармацыі.

Дзякую, з павагай

А. С. Вячорка,

літаратурны рэдактар

*13 кастрычніка 2013 г.*

хатні тэл. (017)3278834